***Г. Г. Якавенка***
*Навук. кір.* ***С. А. Вяргеенка,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## АТРЫБУТЫКА ДАВЯСЕЛЬНАГА ЭТАПУ ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ

Вясельная абраднасць уключае ў сябе некалькі этапаў.

Сватанне – галоўная мэта – дамовіцца аб шлюбе. Асноўныя рытуальныя дзеянні: перагаворы, мэта якіх – вызначэнне матэрыяльнага становішча маладога, бацькі дамаўляліся аб прыданым, вясельных выдатках і часу правядзення цырымоніі. Асноўнымі атрыбутамі сватання з'яўляюцца гарэлка, хлеб-соль і ручнік. Гарэлка, хлеб-соль сімвалізавалі дастатак і маглі выступаць сродкам згоды ці нязгоды маладой на шлюб. Гэтай мэце служылі і такія атрыбуты, як гарбуз, лапаць і венік.

На замовінах ручніком звязвалі рукі маладым, што сімвалізавала злучэнне двух родаў. Ручніком перавязвалі сватоў, падкрэсліваючы іх асобыя паўнамоцтвы на вяселлі.

Запоіны ці заручыны – этап, на якім замацоўвалася згода маладой і яе бацькоў на шлюб. Запоіны ўключаюць у сябе наступныя рытуалы: у становішчы над хлебам жаніх і нявеста падаюць адзін аднаму рукі і іх звязваюць ручніком; у якасці выкупу маладой выступалі пачастункі, якія прывозіў малады; бацькі жаніха і нявесты абменьваліся падарункамі; маладой расплятаюць касу, якую яна не заплятала да вяселля; маці або хросная маладой павязвала ручнікамі ці кавалкам палатна ўсіх сватоў жаніха.

Змовіны – этап вясельнага цыкла, які ідзе пасля запоін. «Задача змовін – заручыцца згодай радні жаніха і радні нявесты на шлюб, больш пэўна замацаваць згоду, канчаткова дамовіцца аб усіх падрабязнасцях вяселля» [1, с. 19]. Асноўны атрыбут змовін – пярсцёнкі, якія сваёй формай ўвасаблялі непарыўнае кола, бясконцасць. Маладыя абменьваліся пярсцёнкамі з мэтай забяспечыць доўгае і шчаслівае сямейнае жыццё.

Зборная субота – адзін з этапаў вясельнага цыкла, які ўяўляе сабой развітанне маладой са сваім дзяцінствам і сяброўкамі. Асноўнымі атрыбутамі названага этапу з'яўляюцца вянкі і елка. Вянок з'яўляўся сімвалам бязгрэшнасці, дзявоцтва. Глыбокі сэнс надаваўся і самой форме вянка – круг, які можна трактаваць як неперарыўнае кола. Вянок выступаў увасабленнем доўгага, шчаслівага сямейнага жыцця. Завіванне елкі ўяўляе сабой упрыгожванне рознакаляровымі папяровымі кветкамі, стужкамі, свечкамі і г. д. Елка сімвалізавала маладосць і прыгажосць нявесты. Кветкі, якімі ўпрыгожвалі елку, маглі паспрыяць шчасліваму шлюбу.

Элементы вясельнай абраднасці можна размежаваць па гендарнай прыналежнасці. Сярод атрыбутаў сватання да жаночых адносяцца лапаць, венік, чарка гарэлкі, гарбуз, хлеб і інш. Да мужчынскай на этапе запоін трэба аднесці ручнік, а да гендарна нейтральных – бутэльку і зерне. Атрыбутыка змовін з'яўляецца цалкам гендарна нейтральнай. Гендарна нейтральнай з'яўляецца атрыбутыка змовін. Прадметы зборнай суботы лічацца толькі жаночымі.

### Літаратура

1 Вяселле: Абрад / уклад., уступ. арт. і камент. К. А. Цвіркі; муз. дадат. З. Я. Мажэйка; рэд. тома В. К. Бандарчык, А. С. Фядосік. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 683 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ